Цэна асобнаго нумэру 5 кап

Год IV Вільня 3 (16) дзекабра 1909 г. № 49.

Наша Ніва

Першая Беларуская Газэта з Рысункамі

Выходзіць што тыдзень рускімі і польскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрацііі: **Вільня, Віленская вуліца, д. № 20.**

Цэна з перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 г.—2 р. 50 к,, на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м.—6., к., на 1 мес. — 25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., на 3 мес. —1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

Гэтымі днямі выйдзе з друку

Беларускі Календар

„НАШАЕ НІВЫ“.

★ ☆ на 1910 г. ☆ ★

КАЛЕНДАР выйдзе у двох выданьнях—**лацінскімі** і **рускімі** літэрамі **(6,000 экз.)** Пры календары будуць аддзелы: статыстычны, аб сельскай гаспадарцы ,юрыдычны, літэратурны і т. д. У прыдатку—песьня беларуская **Янука Купалы** „А хто там ідзе“ з нотамі (музыка Л. М. Рогоускаго).

Цэна календара—15 кап., с перэсылкай—**20 кап.**

Календар будзе прадавацца: у канторы **„Нашае Нівы“** у Вільні, 2) у беларускай выдауніцкай суполцэ **„Загляне сонцэ і у нашэ ваконцэ“** у Пецербурзе, 3) па **усіх вялікшых кнігарнях** нашаго краю і 4) Па **усіх агентурах** „Нашае Нівы“ у мястэчках і вёсках. гдзе прадаецца газэта. **Заказы па календар ужо прыймаюцца у канторы „Нашае Нівы“.** Малые грошы да аднаго рубля можно прысыласць пачтовымі маркамі у 2. 5 , 7 і 10 капеек.

Вільня, 3 дзекабря.

За тыдзень мала зрабілося чаго, для палепшэпьня і падняцьця культуры. Дума зацьвярдзіла парадак землеустройства хутароў і др. Левы бок Думы спачатку зрабіў розные папраўкі да закону, гэта удалося зрабіць, бо мужыцкіе дэпутаты сваімі галасамі памаглі, але пад канец мужыкі ізноў адайшлі на право і папраўкі гопнулі. Асталася толькі папраўка, каб банковы доўг лічыўся толькі на новым кавалку зямлі, што прырэжуць да хутара. Закон аб новым падатку на мешчан, Дума аддала ў камісію, каб яго нанова абгледзелі.

Вялікі гоман ідзе ў Думе проціў міністра судоў Шчэгловітова, каторы не захацеў даць адказ Думе. Проціў яго будуць гаварыць навэт абцябрысты. За астатніе дні ешчэ таварыты міністроў Пакроўскі і Крыжаноўскі так сама ў камісіях войстра ставіліся. Пачалі гаварыць аб хмарах, што збіраюцца на Далёкім Усходзе. Кітай будуе жалезные дарогі, каторые меюць ваеннае значэньне, яны ідуць с сярэдзіны Кітая к рускай граніцы; ад Пэкіна (сталіцы) к Кяхце, (пагранічны горад), другая лінія ідзе на Ціцікор, Айгун. Войско сваё Кітай палепшае і лепш арган зуе.

Гэтымі дарогамі, калі іх выбудуюць, Кітайцы могуць падвёзшы войска, адрэзаць Расею ад Владівастока. Думаюць дыпламаты што абучае гэтых штук кітайцоў Японія.

У Англіі назначэны выбары новаго Парлямэнта. Палата лордоў (якбы гасударственны савет) не захацела зацьвярдзіць павелічэньне падаткоў на багатых. Трэба сказаць, што англійская падатковая сістэма гэта якбы невад з вялікімі вочкамі. Дробная рыба (бедные) праскаківаюць лёгка, а з багатых здымаюць залатую шалупіну. Парлямэнт захацеў ешчэ больш шалупіны здымаць. Правіцельство, міністры па выбарах ідуць так сама проціў Палаты Лордоў.

У Францыі па закону чыноўнікі, пачтовые, железнадарожные канцэлярскіе, могуць рабіць саюзы. Паліцейскіе уздумалі так сама зраб ць свой саюз. Спачатку іх хацелі распушыць за гэто. Але кончылося тым, што міністры (самі яны с соціялістоў і радыкалоў) пазволілі зрабіць і паліціі саюз, жыць у таварыстве і памагаць адзін другому у прыватным жыцьцю, і каб было больш справедлівасці у службе.

У ДУМЕ І КАЛЯ ДУМЫ.

Заседаньне 20-ае. Разглядаюць далей праект закона аб безпечэнстве асобы. На гэтым заседаньні дэп. *Марков* (правы ад Курск. губ.) апошнімі словамі аблаяў левых дэпутатоў; ка-дэты і трудавікі выходзяць з залы заседаньнёў. Але п. Марков аб гэтым не клапоціцца

ілаяцца нз кідае. Дума гэты законапраект знайшла саўсім кепска напісаным і перэдала ў новую камісію.

Дума пачынае разглядаць праект перамены закона аб казённых падатках з дамоў ў горадох і мястэчках. Цяпер на падатак бяруць тры капейкі з кожнаго рубля кошту дома, а хочуць зьмяніць, каб браць 6 кап. з кожнаго рубля чыстаго даходу. Калі такі закон пройдзе, казна будзе мець грошы на 4 мільёны рублёў болей з гэтаго падатку. Дэп. *Сінадіно.* (правы ад Бесарабск. губ.) зьвертае ўвагу Думы, што міністэрство фінансоў рупіцца толькі аб тым, каб павялічыць даход казны, а аб інтэрэсах усяго гасударства мала дбае. Дэп. *Шчэпкін* (ад Курск. губэрні) кажэ, што Дума павінна добра аглядацца, пакуль зацьвердзіць такі закон. Міністэрство фінансоў без концу накладае усё новые і новые падаткі, абы даходы казны роўнілісь з расходамі. Вось мы і бачым, што за апошніе часы падаткі на гарадзкіе маетнасьці усё растуць дый растуць.

* * *

Заседаньне 21-ае. Разглядаецца далей праект закона аб падатках з гарадзкіх нерухомых маетнасьцей. Дэпутаты ад гарадоў, бадай што з усіх думскіх парцій, гаварылі проці яго. Дэп. *Еропкін* (акц. ад Разанск г.) кажэ, што закон гэты нарушае правы гарадзкіх самаўраўленьнёў. Глаўная мэта яго—гэта 4 лішніх мільёны рублёў у кішэню казны, а аб правільнай раскладцэ падаткоў дбаюць мала. *Таварыш міністра грошэвых спрау Покровскій* бароніць праект і кажэ, каб у камісію на новы перэгляд яго не адсылалі. Дэп. *Сазановіч* (правы ад Маг л. губ.) за праект, бо ён павелічывае даходы казны, грошэвые справы каторай ідуць надта дрэнна. Толькі адно кепска, кажэ ён, што з Польшчы бяруць меньш падаткоў, як з Расеі. Дэп. *Жуковскі* (паляк Петр. губ.) спрэчаецца с Сазоновічэм і акуратне даводзіць, што Польшча ўжо і цяпер плаціць розных падаткоў на 15 мільёноў больш чым яна павінна плаціць па справядлівай роўнай раскладцэ.

* * *

Заседаньне 22-ое Разглядаецца праект, каб назначыць пэнсіі салдатам, пакалечэным на вайне. Дэп. *Петров* (труд. Перм. губ.) кажэ, што над формай гэтай пэнсіі хочуць накласці на расейскае грамадзянство новы падатак. „Да гэтаго часу ўрад (правіцельство) не клапаціўся аб салдатах. Трудавая група проці праекта". Колькі правых селян так сама гавораць проці яго. Проці і ка-дэты, але акцябрысты і правые хочуць, каб канечне правесьці яго. Дэп. *Кузнецов* (с.-д Екатеріносл губ.) гаворыць, што с. д. будуць падаваць свае галасы проці праекта. „Што году у нас ідзе 600 мільёноў рублёў на войска, а як справа даходзіць да пэнсіі салдатам, дык раптам трэба ўвадзіць новы падатак". Дума праект прыймае.

Дума разглядала запытаньне міністра справядлівасьці аб тым, што Кіеўскі генерал-губэрнатар даў прыказаньне начальніку тутэй-

шай турмы не пускаць адваката Оголевца да арыштанта Жукоўца, катораго ён меўся бараніць на судзе. Генерал-губернатар зрабіў гэта на падставе цыркуляра начальніка турэмнаго управленьня, але гэты цыркуляр саўсім неправільны, бо ён адменяе цьвёрды закон. Дэп. *Лучыцкі* (к.-д. ад г. Кіева) кажэ, што за апошніе годы у нас так завялося, што законы бураца цыркулярамі міністроў. А той цыркуляр, на каторы апіраўся генерал-губэрнатар, гаворыць, што ад асоб каторые могуць перэдаваць падсудным лісты, адбіраецца права бачыцца з тымі асобамі, каторых яны бароняць. Пасьля не дазваляюць адвакатам бачыцца с падсуднымі адзін на адзін, але ставяць ешчэ пры іх турэмнаго надзірацеля, *Міністэр справедлівасьці* (*судоу*) *Шчэгловітов* бароніць міністэрство, але маўчыць пра цыркуляр, а гаворэ ўсё пра адвакатоў: перш адвакаты не датыкалі палітыкі, але пасьля яны сталі займацца палітыкай. Ён кажэ, што цыркуляр гэты быў канечне патрэбен.

Дэп. *Соколов* кажэ, што міністэрство судоў само нарушае законы.

Катаржнікі.

Цесны дворык, нецрыгожэ!
Дзьверы пад замкамі;
У тры сажні агарожа,—
Глуха, як у ямі.
Толькі бразгаюць кайданы
Дзікім бразгатаньнем;
Звон пакутны, звон паганы,
Аддае стагнаньнем.
Родзіць звон той боль у сэрцы,
Смутак наганяе.
Цяжка людзям ў паняверцы,
Доля іх ліхая!
. . . . . .
Сьвеціць сонцэ, жарам пышэ,
У небі ні хмурынкі,
Лёгкі ветрык сад калышэ,
Гойдае галінкі.
Ды жартліва ў двор ўлетае,
Накурыць, папыліць;
Пух у гору падымае,
Кветачку пахіліць,
Прабяжыць і ціха стане.
Звякаюць кайданы.
Зьбілісь ў кучу катаржане,
Від іх змардаваны.
Вот на лаўку яны селі,
Голавы спусьцілі.
Думкі моцна іх здалелі,
Сэрцэ засмуцілі.
Не згадаць іх дум маўчлівых,
Гдзе яны іх носяць:
Мо гуляюць там, на нівах,
А мо волі просяць...
Катаржане-хлебаробы,
Дзеці вёскі, поля.
Того бойка з за худобы
Прывела ў няволю;
Той с суседам пасварыўся,
Ў того зяць паганы;
Іншы з братам як дзяліўся,
Зарабіў кайданы;
Той за нороў свой сярдзіты,
Ці за лішэк жара...
Гэта—цёмны люд забіты,
Беднаты ахвяра.
. . . . . .
Што за думкі? не згадаю;
Цёмна іх гаворка;
Адно толькі добра знаю:
Горка людзям, горка.

Якуб Колас.

У АНГЛІІ

Англія—гэта край, гдзе констытуція заведзена шмат раней, чым ва ўсіх цяперэшніх констытуцыйных гасударствах Эўропы. З даўных часоў воля грамадзянства кіруе тутака ўсемі гасударственнымі справамі. Запраўляе Англіей кароль разам с *парлямэнтом* (думай) і *палатай лордоу* (як у нас гасударственны савет).

У парлямэнт дэпутатоў выбірае ўвесь англіцкі народ; без згоды парлямэнту ні водзін закон у Англіі сілы мець ня можэ. Але с парлямэнту кожны закон павінен ешчэ ісьці на перэгляд у палату лордоў; тутака разглядаюць яго ўжо не выбарные дэпутаты, а назначэные каралём найвялікшые паны-памешчыкі Англіі (лорды) каторые перэдаюць свае мейсцы ў Палаце з роду ў род—найстарэйшым сынom сваім. І вось калі лорды супрацівяцца якому-небудзь пастанаўленьню парлямэнту, то закон так сама не мае сілы. Толькі ў ваднэй справе парлямэнт заўсягды перэважываў: гэта ў справе аб бюджэце (даходах і расходах гасударственых): ад векоў так заведзена, што калі парлямэнт зацьвердзіў бюджэт. дык палата лордоў без ніякай гутаркі, павінна была даваць на яго сваю згоду. І толькі цяпер – некольк дзён таму назад—палата лордоў першы раз нарушыла гэты парадак і адмовілася зацьвярдзіць бюджэт, каторы парлямэнт зацьвярдзіў.

Зрабілося гэта вось чаму. У росшісі даходоў на 1910 год міністэр фінансоў падаў праект, каб павялічыць падаткі з багатых з зямлі і з наследзтва. Але у Англіі блізка ўся земля належыць да невялікай жмені багачоў-памешчыкоў, каторых прэдстаўнікі заседаюць у палаце лордоў. Вось гэтые лорды ня хочуць прыстаць на тое, каб з іх бралі ешчэ больш падаткоў, і таму нарушылі установлены векамі парадак.

Па новым законе багатые будуць шмат плаціць новаго падатку з наследзства (зямлі, дамоў і проч.) 260 мільёноў рублёў у год.

Па англіцкім законам, калі меж парлямэнтам і палатай лордоў падымаецца гэткая спорка, дык кароль закрывае парлямэнт і назначае выбары новых дэпутатоў. А на новых выбарах ужо толькі ад народу залежыць паказаць, чы ён стаіць за старых дэпутатоў, чы за лордоў

Такім парадком, хаця у Англіі дэпутатоў выбіраюць на сем гадоў, апошні парлямэнт пражыў толькі чатыры гады. За гэты кароткі час ён насыпеў зрабіць аграмадную работу. Першы важны закон, які стары парлямэнт завёў, гэта аб пэнсіях старцам: цяпер Англіцкае гасударство корміць усіх сваіх грамадзян, каторые, дажыўшы старасьці, ня маюць сіл да працы на хлеб; такіх старцоў, што акуратне дастаюць ад гасударства пэнсію, ёсць ужо больш за поўмільлёна. Другі закон—аб устройстві дробных селянскіх гаспадарств: па гэтаму закону мейсцовые самоупраўленьня (як у Расеі земства)

маюць правы выкупляць колькі трэба для дробных гаспадароў зямлі ад памешчыкоў без іхняга сагласу (прымусовы выкуп), зямлю тую бьюць на часткі—дробные фальваркі, ці хутары—і аддаюць за невялікіе грошы ў арэнду селянам, бо тые самі ад лордоў ніяк ня могуць дабіцца арэнды. Далей, у *Ірляндіі* (такая старонка у Англіі) ў 1907 гаду парлямэнт прымусіў магнатоў-памешчык ў прыняць на старые мейсцы нек лькі тысяч ірляндзкіх селян арэндароў, каторых памешчыкі гадоў дваццаць таму назад пазганялі з арэнды. Апрач таго там жэ, ў Ірляндіі, заведзен прымусовы выкуп памешчыцкай зямлі для малозямельных селян.—Для рабочых, што працуюць, да стаючы з зямлі каменны вугаль, парлямэнт назначыў ня болей 8 гадзін працы ў дзень. Па новаму закону саюзы рабочых ня маюць павіннасьці плаціць фабрыкантам за іх страты ад забастовак. Заведзены па ўсей Англіі „*камеры*“, каторые павінны глядзець, каб рабочых не лішне марылі работай, а так сама *біржы працы*, што апекуюцца безработнымі рабочымі і шукаюць для іх заробку. Кабетам дадзено права выбіраць і быць выбранымі ў самоупраўленьня (земства), у Ірляндіі, каторую Англія калісь заваевала і ешчэ да недаўных часоў вельмі ціснула, цяпер аткрыты два ірляндзкіе національные універсітэты; пастаноўлено, што с казны будзе выдавацца селянам падмога на палепшэньне гаспадаркі (мэліорацію). Парлямэнт зацьвярдзіў ешчэ шмат дробных вельмі карысных для народу законоў; але, дбаючы аб карысць англічаноў, гэты парлямэнт не забываў і аб тых народах і краёх, каторые Англія сілай назабірала. Вось, як мы ўжо даўней пісалі ў „Н. Н.“, бурскім рэспублікам (у Афрыцэ), заваеваным некалькі гадоў таму назад, цяпер дадзена поўная аўтономія,—значыць, яны толькі лічацца падвластнымі Англіі, але ўсе свае справы самі кіруюць і маюць для гэтаго свой асобны парлямэнт. Так сама ў Індіі, што ўжо даўно належыць да Англіі, дапушчэны да упраўленьня краем тамтэйшые жыцелі, каторые дагэтуль ня мелі блізка саўсім грамадзкіх правоў.

Як бачым, праца старога парлямэнту была вельмі спорная і карысная. А як у Англіі міністры залежаць ад парлямэту, дык правіцельства ішло ўвесь час згодне з волей народных дэпутатоў і перэлічэные законы ня мелі ніякіх прашкод ад яго. І можна сьмела сказаць, што пры свабодных выбарах англіцкі народ ізноў пашле ў парлямэнт людзей, каторые далей павядуць работу закрытаго парлямэнту і перэмогуць лордоў, што так горача бароняць сваю і ўсіх багачоў кішэню.

Вековые таварыства у Гішпаніі.

Хоць ад векоў Гішпанія трымала мужыкоў у цямноце і недапушчала сьветаў народ,—усёж такі не ўдалося ёй загасіць наро-

лепшэньнем свасй долі; пачаў арганізавацца. Перш-найперш пачалі закладаць весковые таварыствы самопомачы.

Усім ведама, што ў вёсках найбьднейшым,—найтрудней і прыходзіцца; вось напрыклад, здабыць добрую гаспадарскую жывёлу. Найбяднейшые малозямельные гішпанскіе хлебаробы больш усяго гадуюць: сьвіньней, трусоў (кролікоў), галубоў і кур Чым лепшы гатунак гэтай жывёлы, тым і карысць дае лепшую мужыку. Каб дагадавацца такой жывёлы гішпанскіе хлебаробы арганізавалі коопэратывы (злучацца сталі ў таварыствы самопомачы), да каторых прылучаліся с кәжнай вёскі прынамсі па пяць чэлавек. Кожны з іх павінен даць у гэты хаўрус, ці як там называюць—Банк самапомачы,—па 12 рубл. 50 кап; гэтые грошы можна плаціць часткамі па 25 кап. у месяц,- Калі хто хочэ і можэ, кладзе ў банк і больш такіх частак (па 12 рубл. 50 к.) грашэй, а банк выплачывае ім за тое па 4% (працэнты) ў год. Грошы паложэные ў банк, можна перэвесці на другога, або перэходзяць у спадку на радню. Банк выдае хаўрусніку на выбар, на кожную яго поўную (12 р. 50 к.) частку,—ці пару гатунковых сьвіней, ці пару вялікіх трусоў; або дзьве пары галубоў, ці пеўня і тры курыцы, і ўсё гэта найлепшаго гатунку. Дачэкаўшы першаго прыплоду, кожны павінен даць дарма двом найбяднейшым мужыком сваей ваколіцы па самцэ тэй жывёлы, якой атрымаў з банку; а рэшта прыплоду, разам с тымі, што ўзялі ўжо з банку,—лічацца тых, што паклалі свае часткі грошэй—то ёсць—арганізатароў, і прынале-жыць да ўсіх іх—супольна. З другога прыплоду—так сама адда-юць пары. Найбяднейшые, атрымаўшые на завод жывёлу. і прычэкаўшы першаго прыплоду, аддаюць з яго доўг арганізатаром, каторые ізноў на такой самай умове, даюць іншым бяднейшым суседзём-хлебаробам.

Вось гэтак, абдарованых селян і жывелы,—з году на год прыбывае ў двое. Праз некалькі часу ўсе бедные малаземельные хлебаробы маюць найлепшую жывёлу; а тые пяць, ці колькі—гаспадароў, што першымі залажылі ў вёсцы хаўрус і далі свае часткі грошэй ў банк, цяпер шчыра пільнуюць за парадкам гадоўлі жывёлы ўсей ваколіцы: каб павёдлуг самак — было колькі трэба самцоў; каб гатунак жывёлы не драбнеў, самцоў не пушчаюць з гэтаго гнезда, да плоду, а меняюць іх з іншымі—дальшымі такімі самымі таварыствамі, а дзеля гэтаго таварыствы драбнейшые злучаюцца ў большые і адны другім шчыра памагаюць.

Вось, як бедные малаземельные гішпанскіе хлебаробы працуюць пад палепшэньнем сваёй долі.

Пара ўжо даўно, каб і наш беларускі хлебароб узяўся за падобную надта патрэбную і карысную працу.

Піліп.

Голас з магілы.

Сонейко было ўжо на заходзе; кідало свае апошніе цёмные прамені і, як бы з вялікай маркотнасьцю, пазірало на магільные, заросшые травой, курганчыкі... Вось, вось ешчэ міне горы, міне лес і... сонейка не стане. Ешчэ раз бліснулі ўжо чырвона крывавые прамені, слізгнуліся па сьвежай магліцы, як бы пацалаваць яе хацелі, і згаслі. З-за лесу сунулася бледная твар месяца. Ціха стало; толькі лісточкі асінкі, як бы спужаўшыся чаго-сь, дрыжэлі.

Я стаяў, апёршыся аб стары патрухлеўшы, дзерэўляны крыж, апусціўшы галаву, а думкі мае ляцелі і ляцелі...

І здавалося мне, што бачу я пад стапамі магіл усіх тых, што там лежаць... і лежалі ўсе яны, якбы жывые, шчасьлівые адпачываючы па доўгай, цяжкай працы...

І здавалося мне, што я чую, ясна чую с-пад гэтых травой паросшых магільных наспаў шэпты:

„Не шкадуй ты нас, што мо прэд часам ляглі мы тут! Не шкадуй, што вочы нашы прысыпаны пяском, а грудзі прывалены каменямі! Не шкадуй, што ўкінулі вы нас у глыб, з якой не ўбачым вашаго сьвету, вашаго сонца! Не шкадуй!!. Сонцэ вашэ ў плямы пабіла — ня грэе яно вас; душнае паветрэ сьціснуло грудзі вашы; на дарозе вашаго жыцьця больш груд, чым над дамавінамі нашымі; цягаеце вы камені цяжэйшые, чым тые, што на грудзі вы нам узвалілі; неба вашэ завалакло хмарамі, сьцямнело — цямней ямы нашэй магільнай... Не шкадуй-жэ ты нас!“...

Голас ешчэ доўга шэптаў.. Аб чым?—ўжо ня помню... Узыйшло сонцэ пекнае, яснае. Ціха стаяла асінка, толькі с лісточкоў яе на магільные наспы, як сьлязінкі, капала раса...

Піліпоў.

Парэччэ.

МАТЧЫНО СЭРЦЭ.

(З украінскаго).

Пакахаў адзін хлапец маладую дзяўчыну. Вельмі была яна пекная, але гордая жорсткая сэрцэм; яна нічога не знала лепшаго і даражэйшаго на сьвеці, апроч сваей красы.

Прысьнілося ёй, што яна будзе маладой і пекнай да сьмерці, ды ешчэ пекнейшай стане тады, калі заўсёды будзе мець пры сабе схованае сэрцэ тэй асобы, каторая радзіла на сьвет яе мілаго.

І сказала дзяўчына хлапцу:

— Ідзі, забій на сьмерць сваю матку, вырві ў яе сэрцэ і прынясі яго мне.

Аж жахнуўся хлапец і ўцёк далёка, далёка...

Але вочы яе клікалі яго і здалёку,—на другі дзень вярнуўся да каханай дзяўчыны.

Ізноў кажэ яна яму:

Ідзі, забій на сьмерць сваю матку, вырві з яе грудзей сэрцэ і прынясі яго мне. Гэта на тое, каб я была маладая і прыгожая да сьмерці і каб да сьмерці я цябе любіла.

— Цыц! Цыц!—крычаў хлапец, затыкаючы вушы.

Але яна апьяняла яго сваімі пацалункамі і за кожным пацалункам казала:—зрабі гэта, зрабі гэта! Пакажы, што ты папраўдзі мяне кахаеш. Хто любіць, таму ўсё можна.

Іон чуў, што вар'яцее, вырваўся з яе рук і уцёк далёка, далёка...

І зноў страшэннымі чарамі дзявочай красы вярнула яна яго да сябе. І ешчэ крапчэй апьяняла яго сваімі пацалункамі і ешчэ лепей прасіла:

— Ідзі, забій сваю матку і вырві ў яе сэрцэ з грудзей. Тады буду кахаць цябе ўвесь век і ўвесь век буду маладой і пекнай.

А ён казаў, як звар'яцеўшы, атказываў:—Не, немагу.

— Дык я пакахаю такога, што мне зробіць гэта! Ідзі ад мяне! — сказала дзяўчына і адштырхнула яго ад сябе і пайшла адтуль.

Бытцам звар'яцеўшы, цягаўся хлопец увесь дзень, ня ведаючы дзе, а як пачало зьмеркацца, ён паляцеў да хаты і зрабіў тое, што казала яму дзяўчына.

Трасучыся ўвесь, ляцеў ён да сваей мілай, трымаючы ў руках матчыно сэрцэ. І раптам спаткнуўся, бразнуўся і моцна пабіўся аб камень. Іон заенчыў застагнаў. А матчыно сэрцэ, аблiваючыся крывёй, адазвалося да яго ласкавым голасом:

— Ты зьбіўся, мой сыночэк даражэнкі? дзе табе баліць, галубочэк?..

Перэклаў **Швайка**.

Лісты да Рэдакціі.

I.

Жадаю вашэй газэце доўгаго жыцьця і працы для адрадзэньня братняго Беларускаго народу. Каб цёплае і сьветлае сонцэ ўрэшце засьвяціло над ўсёй працавітай Беларускай зямліцай.

Д-р. Кучэвскі.

Закопанэ, Аўстрыя.

II.

Нехай жыве „Наша Ніва“ на доўгіе годы! Хай ведаюць усе, што „ёсць і ў нас наськая вольная мова!“

Пецербургскіе курсісткі і студэнты—беларусы.

Зося Хеуковіч.
Наталка Говорская,
Настася Кубрак,
Ольга Меншыкова,

Александра Романова,
Эльжбета Корнілавіч,
Наталка Касаткіна,
Леон д Адамовіч,
Б. Сівіцкі.

III.

Пасылаю сваё шчырае прывітаньне „Нашай Ніве“ і ўсім яе супрацоўнікам ў трохлетнюю гадоўшчыну яе вялізарнай працы на карысць роднаму краю. Закінуты доляй надта далёка ад сваей бацькоўшчыны — Беларусі— ў самае сэрцэ Украйны, я ня маю можнасьці быць ў безпасрэднай еднасьці с братамі беларусамі, я шчыра веру, што духоўная еднасць ніколі не рвецца: падтрымываецца яна праз дарагую „Нашу Ніву“. Мне давялося чытаць „Нашу Ніву“ за ўсе часы яе жыцьця на сьвеці, і вось я цьвёрда праканаўся, што чым больш я чытаю яе, тым больш яна робіцца бліжэй, радней і мілей маю сэрцу. Вялізнай уцехай бываюць тые хвіліны, калі я чытаю родную газэціну: мысьлямі перэнясешься ў мужыцкіе вёскі, у бедные халодные хаты, ўстае і праходзіць прад маімі вачмі ўсё блізкае, ўсё роднае.

Янук Журба.

IV.

Дзеці Беларусі шлюць вам сваё шчырае прывітаньне с трохлетняй прашай. Ужо тры гады, як вы разносіце словы праўды, сьвет навукі і національнай сьведамасьці ва ўсе куткі нашай роднай зямліны. Праца Ваша не прапала дарма: сяўба ўжо дала добры ўсход. Гэта і прыхільнасць к Вам лепшых беларусоў, хай дадуць Вам сілы працаваць так сама і ў гэтым, чацьвёртым гаду.

Працуйце! за Вамі стаіць грамада, а яна „вялікі гмах“!

Вучні Глухоўскаго Вучыцельскаго інстытута (Чэрнігоўскай губэрні).
Леў Кутас (Мінскай губ.
К. Карповіч (Мінскай губ.)
І. Ляшок (Гродн. губ.)
Вл. Обухоўскі (Магілеўск. г.)
Ів. Белеўскі (Мог. губ.).
Г. Іваноў (Вітэбск. губ.)
Адам Конопа (Мінск. губ.)
Юрка Каханоўскі (Магілеўск. г.)
Янук Прыходзько (Мінск. губ.)
Алесь Ярошэвіч (Мінск. губ.)
Алесь Татур (Мінск. губ.

г. Глухоў Чэрнігов. г.

V.

НАША РАДАСЦЬ.

С поўначы вецер ляцеў к нам
І стрэхі у нас абдзіраў...
Доўга мы ветра прасілі,
Каб нашую мову прыслаў.
Доўга прасілі, чэкалі—
Нічога ён нам не сказаў.
Віўся, круціўся, на стрэхах,
Тры рокі таму, як прапаў.
Вецяр з усходу завеяў
І „Нашую Ніву“ прынёс,
Хаты цяпер ужо цэлы,
Менш лаяк і гора і сьлёз.
Цешся ты наша старонка,
Што нашая мова жыве,
Што сонцэ нам сьвеціць і грэе
Што сэрцэ так радасно бье.
Сораму ўжо нам ня будзе
Рэдакція ёсць і для нас.
Дзякуем шчыра усе мы
І шлем прывітаньне да Вас!

Ілья Дзешко.

Вялікая Бярэстовіца Грод. г.

СЬНЕГ

—о—

(Па Пшыбышеускім).

Залегла як пасьцель
Лебедзіная бель
На загон, на курган.
І кажан, і груган
Занямеў не на сьмех:
Гэта сьнег, толькі сьнег...
За старухай зямлёй
Ты пасьцель, дружэ мой,
Узваліў на душу,
Якбы крыж на мяжу
І ўжо рад не на сьмех:
Гэта сьнег, толькі сьнег...
Думкі, сэрцэ, паглёд
Абліў лёд, скаваў лёд.
Так спавіў, спавіў сам
Каб лягчэй было там,
Дзе жыцьцё не на сьмех,—
Гэта сьнег, толькі сьнег...
Ты і жыў, і любіў,
Ты ня ўмёр і забыў.
Каб нічога ня дбаць,
Сьмела ў даль паглядаць,
Быць самым не на сьмех...
Гэта сьнег, толькі сьнег.
Хтось—сваяк, не сваяк—
Як жыў скончыўся так.
Прагудзеў поп і звон,
Ідзі з памяці вон:
Бой за хлеб не на сьмех!
Гэта сьнег, толькі сьнег.
Мо і лёгкіе дні
Не зачэпяць ані
Ні беда, ні нуда,
Ні агонь, ні вада.
Само счасьце, сам сьмех!
Гэта сьнег, толькі сьнег...

Янук Купала.

Вільня.

Аб усём па троху.

У Швэцыі ёсць горад Тадахом, дзе апрача сернікоў, нічога больш не выраблюць. У адзін дзень іх робяць 200 тысячоў штук; а ў год—73 мільярдоў; 300 электрычных машын рэжуць і клеюць каля скрынкі да сэрнікоў.

* * *

Амэрыканскі багач Рокфэллер афяраваў на розные добрые справы 240 мілл. руб.; другі багач. Кэрнеджы — 140 мільёноў рублёў.

* * *

Да капелюшоў усіх кабет Эўропы ужываюць пёроў ад 300 мільёноў пташак у год.

* * *

У Аўстрыі ёсць гор. Ксельбэра, у вокал катораго шмат залежоў солі; дык цэна яе такая малая, што з гэтай солі будуюць дамы і брукуюць вуліцы.

* * *

У Амэрыцы зрабілі фэрму, дзе гадуюць лісоў і маюць з гэтаго вялікіе даходы.

* * *

Каб чэлавек, у колькі раз болей важэ ад блахі, ў столькі разоў спрытней і скакаў за яе,—то мог бы скакаць праз 100 саж. Каб павэдлуг сваеі вагі супроціў польнаго коніка (траскунчыка) меў чэлавек і голас,—чуваць было-б яго праз 2500 вёрст.

* * *

У Індзіі гіне ад гадзін больш як 22 тысячы народу ў год.

* * *

Найніжэйшая кабеціна жыве ў Чыкаго (Амэрыка); ёй 32 гады, важыць 27 фунт., узросту мае усяго 15 вяршкоў.

* * *

У Афрыканскай зямлі—Конго, калі кабета заўдавее, каля сваёй хаты вывешывае на доўгай жэрдцы флаг, і пакуль яго вецер хоць крыху не надарве,—

яна ня мае права другі раз ісьці замуж.

* * *

Найболей нюхаюць табакі ў Кітайшчыне; яе выпісываюць з Гішпаніі і чым старэйшая табака, тым даражэй плацяць. За 100—200 летнюю табаку плацяць па колькі сотак тысячоў рублёў.

* * *

У Аўстрыі, каб абараніцца ад суслікоў (шкоднікі, што зніштажаюць засевы, крыху падобные да мышэй) выдалі болей як 30 мільёноў грошэй.

* * *

Павук можэ выжыць без яды круглы год.

* * *

Да недаўнаго часу паперу рабілі з ануч, і цяпер лепшую паперу робяць так сама; але апошнімі часамі прыдумалі і ужо робяць с паперы калёсы пад вагоны, бутэлькі і шмат іншых рэчэй; маюцца ешчэ рабіць мехі і ўселякую бялізну.

* * *

У Кітайшчыне, дзе як кабеты, так і мужчыны носяць доўгіе валасы, цяпер пачалі прадаваць іх; так у 1908 гаду прадалі 7 тысячоў пудоў.

* * *

Відэлец, які знойдзеш цяпер нават у беднай хаце, першы быў зроблены з золата 855 год таму назад.

* * *

Парыжскі купец, жыд Озірыс, афяроваў 32 мільёны франкоў на Пастэрэўскі Інстітут, дзе вучоные абдумываюць лекі проці хвароб. Пастэр выдумаў лекарства ад шалёнай сабакі. Ру—проціў дэфтэрыка у дзяцей і т. д.

* * *

На баларскіх (Аўстралія) астравах расьце такое велізарное дрэво, што ў год дае 15 тысячоў апэльцыноў.

* * *

Каб зняць тэлеграфные дроты ўсяго сьвета, занялі б яны ў доўжкі 2 мільёны вёрст.

* * *

Самае высокае дрэва расьце ў Аўстраліі; мае яно 186 арш. вышыні.

З Беларусі і Літвы.

(Ад нашых карэспадэнтоў).

Вільня. Падпаручык Орлов, лячыўшыся ў бальніцы, ўзлез на плот, каб паглядзець на вуліцу. Дзяжурны салдат сказаў яму злесьці; афіцэр саскочыў с плоту і даў поўху салдату. Яго за судзілі за гэта на 5 дзён арэшту, а салдата, што не с пашаннсьцю адазваўся да афіцэра,—на 2 с паловай гадоў у дысцыплінарны батальён.

М. **Лебедзево,** Віл. губ. Вілейск. пав. На парабка з маёнтка Маліноўшчыны—Базыля Жамойціна, каторы варочаўся з Лебедзева, напалі каля в. *Лобачоукі* нейкіе людзі і пачалі біць; але недалёка жылі людзі, — пачулі крык, і гаспадар хаты абараніў Ж-на. Пасьля дагналі Ж—на нападаўшые і адзін з іх прыкончыў яго нажом у галаву. Яго арыштавалі, а ён выказаў сваіх хаўруснікоў. *Цыпрук.*

Валожын, Віленск. губ. Каля нас сенажаці балотлівые і сена з іх возяць зімой, а цяперэшняй дарогай дастаць яго нельга, дык нашая скацінка галадае надта на аднэй саломцы.

Стары Улас.

М. **Красное**, Віленск. губ. Вілейск. пав. У нашым мястэчку зладзеі недаўна убіліся ў ночы ў краму і пачалі там па свойму гаспадарыць і парадкаваць. За сьцяной спаў гаспадар—Плотнік; прачнуўшыся нарабіў гвалту і зладзеёў прагнаў. Тады яны паехалі да другого жыда, што дзержыць рэстаран; выкацілі пачатую бочку с селедцамі, ускацілі яе на воз, дый пачалі ўцекаць; жыд прачнуўшыся, давай іх даганяць; зладзеі скінулі на ўцеху гаспадару з воза 16 селядцоў, а з рэштай ўцяклі.

= 25 наября сьнег саўсім прапаў і селяне вельмі цешацца, што надзея ёець ешчэ на жыта, бо перш баяліся, што сьнег атпарыць. Дарогі нема саўсім і дроў трудна дастаць, дык пачалі красьці бярозы с тракту. Дрэнная, ой, вельмі дрэнная работа! Год у год—шмат гіне мяцеліцамі людзей, дзеля таго толькі, што нема знакоў каля дарогі. За граніцай дарогі абсаджываюць фруктовымі дрэвамі, і там ня толькі дрэвы цэлы, але і яблачка ніхто не зачэпіць. І выходзіць—„што край, то абычай!..

Баутручок.

В. **Літва**, Віленск. губ. Ошмянскаго пав. Полоч. вол. Недаўна некалькі падросткоў напалі на варочаючагося з валаснога суда Змітра Карташэвіча і забілі яго, саўсім адкруціўшы галаву. Нябошчык ня цешыўся добрай славай у сваіх суседзёў, бо уважалі яго за зладзея і забяку. Западазрэных арыштавалі. *Ц. К.*

Мазыр, Мінск. губ. Перэежджаючы Прыпець утапілося 30 чэлавек; 3 выратавалі. *Вл.*

Мінск. Памёр раптоўна вядомы Густав Шмідт.

Ляховічы, Мінск. губ. і пав. Тутэйшую валасную почту трымае Міхась Церэшка; сын яго—Юзя служыў пры ёй 14 гадоў за фурмана Недаўна паехаў ён с памошнікам леснічаго у аб'езд; па дарозе -- падпілі, і памошнік ляснічаго вярнуўся з дарогі з нежывым ужо фурманом.

Падарожны.

М. **Капыль**, Мінск. губ. Слуцкаго пав. Шмат гадоў жыў у нас доктар Раб—іч Ён быў крывы, хадзіў на аднэй жалезнай назе, але шмат грошы, кажуць, назбіраў. Вось паехаў ён недаўна да хвораго ў мяст. Цімковічы; ў дарозе захварэў; далі телеграму ў Несвіж і Слуцк па дактароў; тые з ехаліся, але рады даць не маглі,—Раб—іч памёр. Але ён лежаў тры дні няхованы. Бо у жыдоў трэба плаціць за магілкі на кагал, а жонка яго нешта спіралася. Наастатак дала 100 руб. і яго пахавалі. Мясцовые яго шкадуюць. *Таракан.*

Гродно. Ішла па вуліцы с торбачкай ў руках кабета. Неякі жыдок падляцеў, вырваў торбачку ў каторай ляжалі грошы і давай уцекаць. Ажно двох салдатоў угледзялі гэта;—злавілі жыдка, а кабеце аддалі торбачку. Паліція вінаватаго затрымала.

Алексюк.

Гродно. Да чаго можэ прывясьці пьянства і злые таварышы сведчыць нам такі прыпадак.—Колькі дзён таму назад сабраліся ў карчме хлопцы. Доўга яны сядзелі, пілі, вялі вясёлую гутарку; ажно адзін сказаў штосці наперэкор другому. Пачалі сварыцца, а пасьля давай і біцца. На аднаго з гэтых хлапцоў таварышы мелі даўно злосць, дык зьбілі яго на сьмерць, прапаролі

нажом бок і, каб ніхто аб гэтым не даведаўся, наняліфурманку, палажылі забітаго, а мужыку сказалі, што гэты хлапец так напіўся, і прасілі каб ён адвёз яго да хаты бацькоў, што жывуць за колькі вёрстаў ад Гродна. Мужык прывёз хлапца на падворак бацькоў, і толькі тады ўгледзеў, што ён быў акалечэны. На другі дзень хлапец памёр.

= Тутэйшая Судзебная Палата разглядала справу адваката Гілерсона. В навацілі яго ў тым, што ён на беластоцкім працэсі аб пагроме гаварыў бытцам, проціў правіцельственные рэчы. Шмат сабралося з цэлай Расеі на гэта дзела адвакатоў, каб бараніць свайго таварыша. Найлепш гаварыў адвакат Грузэнбэрг, каторага хацелі выбраць у Думу ад Вільні, як мудраго чэлавека, што добра разумее законы. Многа так сама гаварылі адвакаты Евсеев, Андронніков і іншые. Але судзебная палата Гілерсона засудзіла на год у крэпасць.

У м. **Росі**, Гродз. губ. недаўна быў такі прыпадак.—Двох людзей прыйшло да манапольки, адарвалі замок і, ўзяўшы 14 руб, і 2 гарцы гарэлк', пайшлі на хрэзбіны да суседа, што жыў недалёка мястэчка ў вёсцы. Паліція прыйшла ў хату, дзе былі хрэзбіны, пазнала па бутэльках водку, што прапала з манапольки і ўсіх арыштавала. Вось за такую брыду—можэ быць катарга!

А.

Ст. **Парэччэ**, Гродз. губ. і пав. Збавілася нашэ мястэчка і вакалічные вёскі ад недобраго хлапца пьяніцы і забіякі. Ня было ешчэ такога адважнаго, каторы-б адмовіўся „паставіць“. калі Януля (гэтак звaўся хлапец) прыкажэ. Не раз прыбіваў ён без дай прычыны людзей; не раз прападало збожэ з адрыны; не раз пападаўся ў лапы паліціі, але неяк выкручываўся. Але да пары жбан ваду носіць. Недаўна папалася Я. на дарозі нейкая нетутэйшая дзяўчына і яна адмовілася споўніць яго „прыказ“; дык гэты Я., забыўшыся, што тут стаяць людзі, ухапіў дзяўчыну за горла, ўдарыў па твары і вырваўшы торбачку, ў каторай было 11 рублёў, пайшоў да хаты. На заўтра паліція яго забрала. Цяпер людзі цешацца: „німа Я. кажуць яны, дык і твары, і кішэні цэлы будуць,“

Беларускі жыд.

---

* * *

(З Украінскаго).

Што пяць вёрст, то ўжо вядома
Карчма зараз будзе,
Бо пяць верст кавалак споры—
Спачнуць рады людзі.
Во, па шляху з рынку двое
Воз за возам сьледам,
Памаленьку ціха едуць
Гаспадар з суседам.
От так едуць сабе ціха,
З рынку; грошы маюць.
Ляглі пузам на саломе,
Дрэмлюць, спачываюць!
Едуць, едуць дый паснулі
У глыбокай думе.
Скора з іх адзін схапіўся
Клічэ „сьпіш ты, куме?
—„Што гаворыш?—сусед кажэ
—„Ці ты сьпіш—пытаю“.
—„Дзе ты бачыў—дрэмлю толькі,
Думкі адганяю.“
— „Абач, браце, дрэмаць годзе!
Глянь насупраць неба:
Як ты лічыш, колькі к небу
Вёрстаў ехаць трэба?
—А Бог, яго, сьвяты знае
І добрые людзі;

Як здаецца, то ня болей,
А с пяток дык будзе!“
„Што ты, куме, хіба баба
Табе набрэхала,
Каб было пяць вёрст, як лічыш,
Дык карчма-б стаяла.

Аьбэрт Пауловіч.

Мінск.

З усіх старон.

Пецербург. Сэнатор Гарын сканчыў рэвізію, якую ён рабіў у інтэнданцтве. Паказалося, што намеж усіх інтэндантоў было толькі некалькі справядлівых людзей, але і тых выгналі, а то ўсе — хабарнікі, каторые бралі хабары не дзесяткамі, а па чыне —нават соткамі тысячоў. Шмат іх пойдзе пад суд.

Масква. На прадмесьці—Сакольніках знайшлі друкарню соц'ял-дэмократоў. Арыштавалі двох мужчын і кабету.

Васількоў (Кіеўск. губ.). Земскі камітэт пастанавіў зрабіць 6 пробных палёў, 7 пробных вучасткоў і склад гаспадарскіх машын.

Вольск. На вакне жаночай турмы сядзела 7 летняя дачка селянкі Павозівай, каторую высылалі на пасяленьне ў Валогодзкую губэрню. Варгаўнік стрэліў у яе, куля трапіла ў крату вакна і, расплюшчыўшыся, цяжка зраніла дзіця.

Царыцын. За належаньне да соц. дэм. партіі Судзебная палата прыгаварыла двох у ссылку на пасяленьне.

Воронеж. Паліція натрапіла на шайку, што займалася выраблепьнем фальшывых білетоў на жалезные дарогі.

Лібава. Арыштавалі 40 чэлавек, найбольш з маладзежы. Іх вінавацяць ў тым, што яны належалі да рэволюцыйнай арганізаціі.

Екацерынодар Судзебная палата разглядала справу аб пачтово-тэлеграфнай забастоўцэ. 30 чэлавек засудзілі ў крэпасць на розные срокі, 8 апраўдалі.

Семіпалатінск. Ў мейсцовай турме ўжо 5 месяц сядзіць здольны кіргізкі паэта—Ахмэд Байтрусунов. Ў 1909 гаду ён выдаў кнігу—„Крык-Мысал“, дзе былі перэклады 40 баек Крылова. За што яго трымаюць, дагэтуль яму не кажуць.

Новоросійск. Страшэнные паводкі змылі ўсе пасевы і знеслі верхнюю ураджайную зямлю. Вада паднялася на тры сажні.

Ярослаўль. Судзебная палата засудзіла на тры месяцы турмы прыстава Домброўскаго за тое, бытцам ён прысвоіў сабе 700 р. чужых грашэй. Як прачыталі прыгавор, тут-же Д. стрэліў сабе ў грудзі. Яго адвязлі ў бальніцу.

Перм. У турме памёр на сухоты вучэнь тутэйшай бурсы—Марчэнко. Таварышы яго ў бурсе упрасілі бацюшку атправіць па нім паніхіду; той згодзіўся; але наляцеў інспэктар сэмінарыі і ўсіх тых, што маліліся за свайго таварыша, пацягнуў да адказу.

Бэрлін. На тутэйшых немецкіх фабрыках, Японія замовіла сабе шмат гармат.

Сэнт-Поль. (Амэрыка). Забаставало 20 тысячоў стрэлачнікоў.

Порт-Артур. Японскі суд засудзіў на сьмерць карэйца, што забіў іхняго князя –Іто.

Карэя. Пачаліся разрухі ў Карэі. У Японіі ідзе моблізація. У Карэю пасылаецца 16 новых батальёноў. Начальніком назначылі генерала Курокі.

На ўсей Эўропе 22 наября шалела страшэнная бура.

У рэдакцію прыслалі для прагляду:

— **М. В. Довнар Запольскій, В. Н. Тяпинскій, переводчикъ Евангелія на бѣлорусскій языкъ.** У XVI веку, калі наш край беларускі быў пад вялікім ўплывам заходняй польскай культуры, адкуль ішлі новые ідэі рэформацкай веры; тагды уся Эўропа кіпела выробляючы новые рэлігійные формы. Жыцьцё краю нашаго і вера былі ў упадку. Польская навука стаяла тагды надта высока, а беларускіе людзі таго часу не маючы сваей навукі, прыймалі польскую, а сваю національнасць беларускую (ці рускую, як тагды казалі) забывалі. С памеж беларусоў таго часу з'яўляліся людзі, як Тяпінскі (жыў каля 1580 г. ў Полоцкім павеце ў м. Тяпіне), каторые стараліся падняць свой край і сваю націю. Тяпінскі перэтлумачыў Эвангельле на беларускую мову. У прадмове Тяпінскі кажэ, „рад покажоу мою вероу, которую маю, а злашча народу своему роускому", і тлумачыць ён Эвангельля „з зычлівасцы ку моей отчызне", а так сама, „відзячы малую навуку народа, малую руплівасць духоўных аб веры" ...духоўные учіцелі пісьма рускаго не знаюць, не разумеюць і не вучаць... німа школ беларускіх „зачим в польскіе, або в иные письма за такою неволею себе и дети без встыду... заправуют". Ён прызываў паноў і духоўных падняць прасьвету народа: „только вы паны, моглібы пріті на помоч любячы свою отчызну",—„простога чоловека беднаго, посполітаго на вас очы завжды оудавала и за вами идет..."

ЖАРТЫ.

На што?

— Цыгане, чаму ты хаты не накрыеш? Яна ж цячэ?!

— Як жэ яе крыць цяпер, калі дождж ідзе.

— Ну не цяпер, але тады як пагода.

— Як пагода? А тадыж на што?

У вагоне.

Дзядзька пытаецца ў сваей жонкі:

— А ці добра табе там сядзець?

— Надто добра.

— А ці не халодна?

— Дый не, не трывожся.

— А з вакна не цягне?

— Ані крышку.

— Ну дык пусьці мяне туды, а сама седай на маё мейсцэ.

Навучыцца.

— Пане, конь захварэў, ня пье саўсім.

— Дык яго ў старшыны выберыце—то і піць пачне.

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.